## Адным абзацам

* * *

Маладзёжны працоўны дэсант па аказанні дапамогі сельскагаспадарчым арганізацыям у зборы ўраджаю садавіны і агародніны працуе ў вобласці. Маладыя людзі з энтузіязмам шчыруюць на палях. Так, у Кіраўскім раёне моладзь занята зборам яблыкаў і буракоў. Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій, Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, МДУ імя А.А.Куляшова задзейнічаны ў зборы морквы ў ААТ "Фірма "Кадзіна". Студэнты БДСГА аказваюць працоўную падтрымку гаспадаркам Горацкага раёна. Працоўны дэсант з моладзі будзе працаваць да канца верасня і завершыцца акцыяй "Рабі дабро!".